# ЛЕПШЫ БІБЛІЯТЭКАР РАЁНА

***У пачатку снежня ў культурным жыцці раёна адбылася важная падзея — конкурс прафесійнага майстэрства. Гэтым мы прыпомнілі добрую ранейшую традыцыю. Але конкурс знамянальны яшчэ і тым, што праходзіў ён у новым памяшканні цэнтральнай раённай бібліятэкі.***

***Колькі год мы марылі аб новым будынку, які б адпавядаў сучаснаму іміджу ўстановы культуры! І вось, дзякуючы намаганням загадчыцы аддзела культуры райвыканкама Р.Л. Рэут і дырэктара бібліятэкі Г.А. Казловіч, адбылося адкрыццё ўтульнага памяшкання, адрамантаванага па еўрапейскаму стылю.***

На конкурсе прафесійнага майстэрства прысутнічалі людзі, якія нераўнадушныя да патрэб бібліятэчных устаноў, дапамагаюць нам матэрыяльна. Сярод іх — старшыня Міханавіцкага сельвыканкама Валянцін Уладзіміравіч Драздоў.

На званне "Лепшы бібліятэкар раёна" прэтэндавалі: Алена Васільеўна Макарчык — загадчыца Пятрышкаўскай сельскай бібліятэкі, Таццяна Паўлаўна Бей — загадчыца Калодзішчанскай бібліятэкі № 2, Валянціна Рыгораўна Раеўская — загадчыца Старынскай бібліятэкі-клуба, Святлана Уладзіміраўна Седлерава — загадчыца Калодзішчанскай бібліятэкі №1, Людміла Уладзіміраўна Шавель — загадчыца бібліятэкі Замастоцкага цэнтра адпачынку, Жанна Міхайлаўна Пятрова — загадчыца Дубіцка-Слабадскога клуба-бібліятэкі і Таццяна Васільеўна Вільчэўская — загадчыца аддзела абслугоўвання раённай бібліятэкі.

Конкурс складаўся з чатырох тураў, кожны з якіх уключаў некалькі заданняў. У першым туры ўдзельніцы паказалі выдатныя веды літаратуры. Ім трэба было адказаць на пытанні: "Гартаючы літаратурны каляндар", "Гэтыя звычайныя і незвычайныя жанчыны", "Аб каханні паэтычным словам". Хоць заданні былі складаныя, усе канкурсанткі справіліся з імі выдатна. Праўда, Т.П. Бей адказвала больш дасканала, даючы вычарпальныя адказы на пытанні.

У гісторыка-краязнаўчым туры, які ўключаў веданне гісторыі Беларусі, Мінскага раёна, народных свят, звычаяў, абрадаў і бібліятэчнай справы, лепш за ўсіх выявіла свае веды С.У. Седлерава.

Вельмі цікава прайшоў прафесійны тур, дзе канкурсанткі дэманстравалі свае навыкі, веданне бібліятэчнай справы. Ім трэба было за лічаныя хвіліны знайсці адказ на зададзеную бібліяграфічную даведку. Усяго за 10 хвілін яны прыдумалі рэкламу сваёй бібліятэцы. Якія паэтычныя радкі выйшлі з-пад іх пяра!

Аднак для гледачоў самым цікавым было хатняе заданне, якое павінна перадаць твар кожнай канкурсанткі. Найбольш захапляючае: "Калі тэатр пачынаецца з вешалкі, то з чаго пачынаецца бібліятэка?" было ў загадчыцы аддзела абслугоўвання і інфармацыі раённай бібліятэкі Т.В. Вільчэўскай, а таксама ў Л.А. Шавель з Замасточча.

Конкурс-фантазія "Карнавал літаратурных герояў" перайшоў у шоу-парад. Перад гледачамі паўсталі два Астапы Бэндэры з рамана Ільфа і Пятрова, пан Быкоўскі, Паўлінка і Агата з купалаўскай "Паўлінкі", Эліза з камедыі Б. Шоу "Пігмаліён", чорт Салоха з гогалеўскіх аповесцей і многія іншыя казачныя героі.

Каб гледачы не засумавалі, работнікі раённай бібліятэкі ў час падрыхтоўкі канкурсантак да выхаду, праводзілі з прысутнымі віктарыны, давалі ім метадычныя рэкамендацыі, дэманстравалі незвычайны паказ моды. У прамежках паміж выступленнямі гучалі гумарыстычныя песні ў выкананні нашых супрацоўнікаў.

І вось наступіў адказны момант — вылучаць пераможцу. Пасля падліку балаў журы, ёю аказалася Таццяна Вільчэўская. Загадчыца аддзела культуры райвыканкама Р.Л. Рэут павіншавала яе і ўручыла галоўны прыз — радыёпрыёмнік. Прыз глядацкіх сімпатый дастаўся Жанне Пятровай.

**Любоў КВІТЧАНКА,**
**загадчыца бібліятэкі п. Лясны.**

Наша жыццё. - 1998. - 24 снежня